ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (832) ● Чацвер, 16 снежня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV





У РЭКТАРАЦЕ

## ДАКЛАДНА І Ў ТЭРМІН

На пасяджэнні рэктарата абмеркавана пытанне аб правядзенні зімовай экзаменацыйнай сесіі. З паведамленнем аб падрыхтоўцы да сесіі і прапановамі па яе лепшай арганізацыі выступіў начальнік вучэбнай часткі В. С. Далгарукаў.

Экзамены і залікі будуць праводзіцца адпаведна палажэнню, якое неабходна давесці да ведама ўсіх студэнтаў, асабліва першакурснікаў, падкрэсліў В. С. Далгарукаў.

Да ўстаноўленага тэрміну трэба завяршыць планаванне сесіі. Пры састаўленні раскладу залікаў і экзаменаў мець на ўвазе пажаданні студэнтаў аб больш зручных для іх тэрмінах.

Напярэдадні экзаменацыйнай пары прапанавана правесці шэраг лекцый па асабліва цяжкіх раздзелах вучэбных дысцыплін. На кожным факультэце плануецца адвесці аўдыторыі для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў. У строга ўстаноўлены тэрмін неабходна арганізаваць планавыя кансультацыі.

Звернута ўвага на тое, каб на ўсіх кафедрах па прадметах, якія выносяцца на сесію, былі вывешаны спісы рэкамендаванай літаратуры загадзя складзены і зацверджаны экзаменацыйныя білеты, падрыхтаваны задачы па фізіцы і матэматыцы.

Падкрэслена, што экзамены могуць прымаць толькі выкладчыкі, вёўшыя лекцыйныя курсы.

Выказана патрабаванне правесці зімовую экзаменацыйную сесію ва ўстаноўлены тэрмін і адпусціць студэнтаў на канікулы з 25 студзеня да 7 лютага.

Наш кар.



НА ЗДЫМКАХ (зверху ўніз):

● ідуць лабараторныя заняткі ў студэнтаў II курса хімфака. Вопыт па якаснаму аналізу праводзіць **Валя Корбан**; вынікі даследаванняў **Наташы Дзеянковай** правярае асістэнт **Я. М. Рахманенка**;

● студэнты V курса гістфака **Люда Пятручык** і **Уладзімір Асіпчык** у кабінеце гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў рыхтуюцца да сваіх апошніх залікаў.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК

## «ВУЧЫЦЦА КАМУНІЗМУ»

**Пад такім дэвізам праводзяць камсамольцы юрыдычнага факультэта залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС—у жыццё!».**

У асабістым комплексным плане ўдзельніка Ленінскага заліку ёсць два пункты: вучоба на добра і выдатна і грамадска - палітычная актыўнасць. Сюды ўваходзіць вучоба ў школе маладога лектара, выступленні з лекцыямі і дакладамі, удзел у навуковых гуртках, канферэнцыях, конкурсах навуковых работ.

Усе гэтыя абавязацельствы паспяхова выконваюцца. Амаль кожны другі студэнт пятага курса ўжо выступіў з лекцыяй, шмат камсамольцаў удзельнічаюць у рабоце студэнцкага дыскусійнага клуба «Мастак», у якім моладзь знаёміцца з творамі сучасных мастакоў, абмяркоўвае праблемы мастацтва, вядзе дыскусіі па іншых праблемах.

Рэгулярна праводзяцца нарады камсамольскага актыву, дзе абмяркоўваецца ход Ленінскага заліку, справаздачы курсавых камісій.

Т. ЯРАШЭВІЧ.

## ШТО ПЛАНУЮЦЬ КАНТРАЛЁРЫ?

Адбылося пасяджэнне універсітэцкай групы народнага кантролю з удзелам старшынь факультэцкіх груп. Абмеркаван і зацверджан план работы на 1972 год. Пры яго распрацоўцы ўлічаны крытычныя заўвагі і прапановы, выказаныя на універсітэцкай справаздачна-выбарнай канферэнцыі.

Чым жа будуць займацца народныя кантралёры ў новым, 1972 годзе?

**Па сектары вучэбнай работы** намечана праверыць: правільнасць вызначэння аб'ёму вучэбнай нагрузкі прафесарска - выкладчыцкага саставу; тыднёвую загрузку студэнтаў у адпаведнасці з вучэбным раскладам; бюджэт часу студэнтаў для самастойнай работы; стан вучэбнай работы ў сувязі з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Па сектары навуковай працы:** выкананне планаў навукова-даследчай работы; выкарыстанне навуковага абсталявання ва універсітэце; складанне выдавецкіх планаў і іх выкананне.

У цэнтры ўвагі **сектара быту** будзе работа здраўпункта універсітэта; работа сталовых і буфетаў; падтрыманне правіл сацыялістычнага супольнага жыцця ў вучэбных карпусах і інтэрнатах; правільнасць назначэння стыпендый студэнтам.

**Сектар аховы сацыялістычнай уласнасці** разгледзіць стан захавання інвентару; спагнанне матэрыяльнай страты, прычыненай універсітэту; стан работы з матэрыяльна адказнымі асобамі; праверыць наяўнасць маёмасці, замацаванай за кафедрамі.

**Па сектары заяў і скарг** намечана праверыць, як працуюць з заявамі і скаргамі на факультэтах; наяўнасць пасадных інструкцый для вучэбна-дапаможнага персаналу на факультэтах.

У плане **сектара арганізацыйнай работы:** вывучэнне вопыту некаторых груп народнага кантролю факультэтаў; выпуск чатырох «Старонак народнага кантролю»; правядзенне другога агляду сродкаў галоснасці ў рабоце груп народнага кантролю; арганізацыя 4-х заняткаў у «Школе народных кантралёраў».

На пасяджэнні адбыўся абмен думкамі па пытаннях арганізацыі практычнай работы народных кантралёраў. Асаблівая ўвага была звернута на неабходнасць павышэння эфектыўнасці праводзімых народнымі кантралёрамі мерапрыемстваў, што ў значнай меры залежыць ад цесных кантактаў у рабоце факультэцкіх груп народнага кантролю з універсітэцкай групай, з грамадскімі кантралёрамі прафсаюзных арганізацый і камсамольскімі «пражэктарыстамі».

**Я. ТАГУНОЎ,**
**старшыня універсітэцкай групы народнага кантролю.**

## ЗЛЁТ СЯБРОЎ ДРУКУ

Два дні працягваў работу рэспубліканскі злёт рабселькораў. На ім прысутнічалі лепшыя няштатныя аўтары маладзёжных газет «Чырвоная змена» і «Знамя юности», маладзёжных рэдакцый Беларускага тэлебачання і радыё. У іх ліку каля 20 студэнтаў нашага універсітэта.

Злёт адкрыў першы сакратар ЦК ЛКСМБ Уладзімір Падрэз. Затым з цікавымі дакладамі выступілі дэкан факультэта журналістыкі БДУ доктар гістарычных навук Р. В. Булацкі, загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, кандыдат гістарычных навук Б. В. Стральцоў, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання дацэнт М. Я. Цікоцкі і іншыя.

Удзельнікі злёту наведалі універсітэт, пабывалі на факультэце журналістыкі, дзе пазнаёміліся з арганізацыяй падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, з творчасцю студэнтаў.

Наш кар.



**НА ЗДЫМКУ:** удзельнікі злёту на факультэце журналістыкі. Фота Л. Калюжнай.

# СЕМІНАР ПАКЛАЎ ПАЧАТАК

На гэты раз семінарскія заняткі па гісторыі КПСС атрымаліся незвычайнымі. Вывучалі матэрыялы XXII з'езда Камуністычнай партыі. Адна з галоўных задач, вызначаных у Праграме КПСС,—фарміраванне чалавека камуністычнага грамадства. Але замест традыцыйных адказаў па падручніках, дапаможніках і канспектах выкладчыца Таццяна Яўгеньеўна Галко прапанавала нам выказаць па гэтаму пытанню свае меркаванні, разважанні, асабістыя думкі.

Пачалі нясмела. Тэма складаная і разам з тым хвалюючая. Хутка завязалася жывая, цікавая размова. Атрымалася нешта накшталт дыспуту. Гаварылі, спрачаліся. Закранулі шмат пытанняў. З чаго пачынаецца выхаванне? Якую ролю адыгрываюць сям'я, школа, камсамол? Асабліва многа спрэчак выклікаў тэрмін «цяжкі падлетак». Як яго перавыхоўваць, чым зацікавіць?

Свае думкі па гэтаму пытанню выказваюць Саша Ступнікаў, Сярожа Ціванаў, Валодзя Купрыенка, Алег Татун. Вывад робяць агульны: для таго, каб перавыхаваць маладога чалавека, патрэбна знайсці для яго справу па душы, заахвоціць і зацікавіць.

А размова працягваецца. Закранут яшчэ шэраг праблем. Чым займаецца моладзь у вольны час, як павышае сваю адукацыю? Ну і, вядома, гутарка ідзе аб тым, якім павінен быць наш сучаснік — будаўнік камуністычнага грамадства. Якімі павінны быць мы, будучыя журналісты, людзі, у чыіх руках магутны сродак выхавання — слова.

Празвінеў званок. Мы пакідаем шумную аўдыторыю. Але размова, што дала штуршок думкам, не закончана. Яна працягваецца.

Л. ЦІМЧАНКА, студэнтка.

*У ГРУПАХ І НА КУРСАХ*





*Ідуць практычныя заняткі па начартальнай геаметрыі ў студэнтаў І курса матфака. Вядзе іх ст. выкладчык Г. В. ХАЛАДЗІЛІНА.*

Фота **Д. Чаховіча.**

# ПОЧЫРК КАЛЕКТЫВУ

Народная прымаўка вучыць: «Маеш сто сяброў — бяду абышоў». Так, з таварышам усюды лягчэй. У групе «Будова рэчыва» лягчэй з сябрамі і ў вучобе. І хоць не сто іх, а толькі адзінаццаць.

Група невялікая, амаль што найменшая не толькі на курсе, а і на ўсім хімічным факультэце. Але гэта не перашкаджае лічыць яе сапраўдным калектывам. Якія падставы? Паглядзім на вучобу. Сярэдні бал паспяховасці ў апошнюю экзаменацыйную сесію самы высокі на факультэце — 4,6. Да гэтай мэты, безумоўна, імкнуцца многія студэнцкія калектывы. Аднак дабіваюцца яе толькі тыя, дзе пануюць згуртаванасць і дружба.

...Першы курс. Першыя хвалюючыя заняткі. Знаёмства. «Няўжо мы аднолькавыя ў поглядах, імкненні знайсці сваё месца ў хіміі? Няўжо адзіных жаданняў, патрэб? — не аднойчы бударажылі думкі.—Канешне, не аднолькавыя, але шмат што нас аб'ядноўвае».

— А калі так, давайце, сябры, разам будаваць калектыў. Сумесна рыхтавацца, сумесна адпачываць. — Запамятаўся аўтар гэтых слоў, але жылі яны ў кожным.

Спачатку не ўсё ладзілася, многае не атрымлівалася. Але рабяты не падалі духам. Сумесныя экскурсіі на заводы, фабрыкі горада, паходы ў музеі, тэатры, кіно наклалі яркі адбітак на пачуццё таварыства. Асабліва добра выявілася ўзаемадапамога ў вучобе. Часамі абмяркоўвалі складаныя пытанні, пакуль не дабіваліся яснасці. Адстаючым аказвалі не мядзведжыя паслугі, а сапраўды таварыскую дапамогу. Але нядоўга гэта працягвалася — адстаючых не стала.

— Вельмі добра, што мы выпрацавалі ў сабе якасці таварыства. Але наша дзейнасць абмяжоўваецца амаль толькі ўласнымі патрэбамі. Не будзем чакаць горкіх заўваг, што мы жывём для сябе. Патрэбна штосьці рабіць для факультэта, грамадства.

Не дарэмна сказаны гэтыя словы камсамольскім важаком Нінай Гурыновіч. З іх пачынаецца шырокае кола грамадскіх спраў юнакоў і дзяўчат. Кожны з іх стаў актыўным удзельнікам СНТ. Павялічылася група мясцовых лектараў. Актыўная грамадская дзейнасць у хуткім часе дала плён. Сябры ўдзельнічалі ў навуковых канферэнцыях, чыталі даклады перад аднакурснікамі і студэнтамі другіх курсаў па праблемах спектраскапіі, аб хімічнай прамысловасці нашай краіны і інш. Нярэдка лектарскую групу цёпла прымалі за межамі універсітэта. Запомніўся даклад Ніны Гурыновіч на тэму «Квантавыя генератары». Неаднаразова з лекцыямі выступалі студэнты-выдатнікі Е. Скакоўскі, А. Урублеўскі, В. Шастакоў і іншыя.

Аднойчы сабраліся рабяты ў падшэфную васьмігодку вёскі Вясёлыя Вуглы Дзяржынскага раёна. Пасля зімовай сесіі палічылі сваім абавязкам наведаць школьнікаў.

— Люты 1971-га быў надзвычай суровы, — успамінае куратар групы, старшы выкладчык В. А. Машынкоў. — Прыехалі ў Дзяржынск. Адсюль да вёскі восем кіламетраў. Рабяты хваляваліся: да сустрэчы заставалася мала часу. Але здарылася нечаканае. З-за неспрыяльнага надвор'я аўтобус не выйшаў на маршрут. Патрэбна было рашаць: ісці альбо вярнуцца.

Завіруха не супакойвалася. Калючы снег балюча біў у твар, ад марозу стыў нос, слязіліся вочы.

— Можа вернемся? Баюся, пахварэеце пасля такога паходу. За гэта нас прабачаць, зразумеюць, што...

— Не, не, Віталь Аляксеевіч! Вярнуцца ніколі не позна. Наадварот, прыемна прайсціся з халадком, паспрачацца са стыхіяй. Ды паабяцалі ж прыехаць! Людзі чакаюць, вераць...

— Так таму і быць, толькі жывей, хутчэй сагрэемся.

Не такімі ўжо і цяжкімі здаліся гэтыя кіламетры. Бадай, наадварот, бадзёрымі, з расчырванелымі тварамі ўбачылі сяброў у школе вучні, настаўнікі. Цёплая была сустрэча. Знаёміліся, расказвалі пра свой нялёгкі «лёс», напатканы ў дарозе, грэліся гарачым чаем.

Хімічны вечар прайшоў цікава. Студэнты расказвалі многа займальнага аб навуцы, яе дасягненнях. Кожны хацеў пачуць адказ на сваё пытанне. Хутка і самі вучні дэманстравалі гасцям цуды хімічных злучэнняў.

Назаўтра рабяты дапамаглі сваім юным сябрам абсталяваць хімічны кабінет. Дырэкцыя школы аб'явіла падзяку будучым калегам.

Напярэдадні юбілею роднага універсітэта рабяты арганізавалі хімічны вечар у адной з сярэдніх школ горада Ракава. Студэнты расказвалі вучням аб БДУ, запрашалі ісці вучыцца на свой факультэт...

Хутка прамільгнулі гады вучобы. Ужо на апошнім курсе група «Будова рэчыва». Здавалася б, апрача штодзённай падрыхтоўкі да дзяржаўных экзаменаў, для студэнта-выпускніка нічога не існуе.

— Вучэбны матэрыял, бадай, з самых цяжкіх наогул на факультэце. Патрэбна шмат працаваць у чытальнай зале, лабараторыях, — гаворыць куратар. — Але рабяты ўсюды паспяваюць: і ў вучобе, і ў грамадскіх справах, і ў спорце. Іх рукамі наладжана эксперыментальна-вымяральная апаратура на кафедры. З душой, з творчым натхненнем выконвалі любое заданне.

Любяць спорт. Вось, напрыклад, А. Урублеўскі — член зборнай факультэта і універсітэта па футболу. Е. Скакоўскі — па валейболу.

Цяпер многа даводзіцца аддаваць часу падручнікам. Але, па традыцыі, рыхтуюцца рабяты да сустрэчы з падшэфнымі.

Хочацца дадаць, што мне давялося вельмі мала працаваць над групай. Усё, што зроблена студэнтамі, — па праву належыць ім.

П. ДЗЕТЛІКОВІЧ, студэнт.

# КНІГА З ДАРАВАЛЬНЫМ НАДПІСАМ

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**Са Сцяпанам Хусейнавічам Александровічам, якому ўчора споўнілася пяцьдзесят гадоў, мне ўпершыню давялося пазнаёміцца недзе ў 1963 годзе, калі ён прыйшоў працаваць на кафедру беларускай літаратуры нашага універсітэта. Па-татарску смуглявы твар, там-сям сівізна ў чорных, як смоль, валасах, ходзіць, крыху пакульгваючы (відаць, адчуваецца франтавое раненне)... Гэта было заўважана адразу тады, восем гадоў назад. А яшчэ — незвычайная, нават, здаецца, неверагодная працавітасць гэтага чалавека, яго прынцыповасць, уменне адстойваць свае думкі, погляды.**

**Прайшло пяць гадоў, і я нібыта па-новаму ўбачыў Сцяпана Хусейнавіча, нанова адкрыў яго для сябе. У 1968 годзе да юбілейнай рэспубліканскай канферэнцыі па праблемах беларускай філалогіі мне давялося складаць бібліяграфічны даведнік прац членаў кафедры. І вось што здзівіла: ніхто з членаў кафедры не мог параўнацца з С. Х. Александровічам па колькасці друкаваных работ. Іх у яго на той час было 172! Гэта, у першую чаргу, кнігі пра беларускіх пісьменнікаў «Незабыўнымі сцежкамі» (2 выданні) і «Па слядах паэтычнай легенды», даследаванні «Янка Купала — майстар мастацкага перакладу» і «Старонкі братняй дружбы», дакументальныя аповесці «Ад роднай зямлі» (кніга перакладзена на рускую і ўкраінскую мовы), «Далёкія зарніцы». І — дзесяткі артыкулаў, рэцэнзій, нататкаў у беларускім, рускім, украінскім друку па праблемах гісторыі беларускай культуры, развіцця беларускай літаратуры XVI—XX ст., славянскай літаратурнай супольнасці.**

**У тым жа 1968 годзе я атрымаў ад Сцяпана Хусейнавіча аўтабіяграфічную аповесць «Далёкія зарніцы» з даравальным надпісам. Прызнаюся: прачытаў я яе ўзапар, адным духам. Мне адкрыліся зусім невядомыя старонкі біяграфіі яе аўтара, пра якія раней толькі цьмяна здагадваўся. Я ведаў, што вучобу ў нашым універсітэце перапыніла С. Александровічу вайна. Паступіўшы ў БДУ ў 1939 годзе, ён скончыў яго (завочна) толькі ў 1950 годзе. Чуў, што чырвонаармеец Александровіч на Крымскім паўвостраве трапіў у фашысцкі палон, яго білі, над ім здзекаваліся. Але тое, што вычытаў у кнізе, нельга было нават уявіць.**

**«— Ты дзе нарадзіўся!**

**— На Беларусі, у мястэчку...**

**— Там татарына і днём са свечкай не знойдзеш! Там у мястэчках адно жыдава жыве. Нябось, я ведаю! Прызнавайся, пархаты!**

**Раптам усё памеркла ў вачах, і толькі аднекуль здалёку даносяцца галасы...**

**Я адчуваю, як нечым цвёрдым б'юць мне ў плечы, па жываце, топчуць пальцы. Але цела адзеравянела, і мне амаль не баліць. Чую яшчэ, як нешта халоднае расплываецца па спіне і шыі».**

**Няўжо такія катаванні мог вынесці чалавек! Аказваецца, мог, і вынес. Больш таго, знайшоў у сабе сілы, каб уцячы з палону, з канцлагера. Канешне, перанесеныя нягоды пакінулі знак на ўсё жыццё. Адазваліся яны і ў сёлетняй цяжкай хваробе Сцяпана Хусейнавіча, якая на цэлы год выбіла яго са звычайнага працоўнага рытму. Але духоўная нязломнасць, жыццялюбства і працавітасць і на гэты раз перамаглі. Дацэнт універсітэта знайшоў у сабе сілы, каб узняцца з бальнічнага ложка і абараніць доктарскую дысертацыю па праблемах развіцця беларускай літаратуры і кнігадрукавання канца XIX—пачатку XX стагоддзя (матэрыял дысертацыі выкладзены ў кнігах «Гісторыя і сучаснасць» і «Пуцявіны роднага слова»). Выпадак сапраўды выключны.**

**...Разгортваю «Далёкія зарніцы» на тытульнай старонцы. Сэрца трывожаць словы аўтарскага даравальнага надпісу: «Каб ніколі ні табе, ні тваім дзецям не прыйшлося перажыць тое, што тут апісана».**

**В. РАГОЙША, дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

# АКТЫЎНАЯ ДАПАМОГА

Хутка ў студэнтаў геаграфічнага факультэта з'явяцца ўсе неабходныя ўмовы для праходжання летняй вытворчай практыкі: непадалёку ад Валожына, у маляўнічым лясным кутку на беразе Заходняй Беразіны будуецца факультэцкая геадэзічная база. У гэтым будаўніцтве студэнты прынялі самы актыўны ўдзел. Часта іх можна сустрэць тут у выхадныя дні.

Нядаўна група студэнтаў II курса працавала на будоўлі, дапамагала будаўнікам у заліўцы падлогі. Калі ўзводзіўся трохпавярховы будынак інтэрната, спецыяльныя пабудовы, студэнцкія атрады I і III курсаў гатавалі цэментавы раствор, разгружалі матэрыялы, складвалі цэглу, выконвалі іншыя работы. Усяго з мая гэтага года яны адпрацавалі на будоўлі базы 1710 чалавека-дзён.

Завяршэнне будаўніцтва плануецца ў будучым годзе. У зімовы час на базе будзе дзейнічаць студэнцкі прафілакторый і лыжная база універсітэта.

Т. ЛУКАШЭВІЧ.

# НАША ГРУПА

**Вось ужо другі год мяне выбіраюць камсоргам III групы II курса на факультэце журналістыкі. За гэты час я па-сапраўднаму палюбіла сваю групу, ганаруся ёю і лічу, што аб ёй трэба ведаць і другім студэнтам.**

**На першы погляд у нас такія ж рабяты, як і ўсе навокал. Часам спазняюцца на лекцыі, калі-нікалі прапускаюць заняткі. Але ў іх сэрцах гарыць агонь непрымірымасці да ўсяго дрэннага. Я думаю, іменна гэты агонь і вылучае іх сярод аднакурснікаў, дае магчымасць праводзіць цікавыя і актуальныя дыспуты, такія, як па аповесці Б. Васільева і спектаклю «А зори здесь тихие»; гарачыя камсамольскія сходы, дзе абмяркоўваюцца не толькі пытанні вучобы, тэматычныя палітінфармацыі, наведванне лекцый, але і ўчынкі некаторых камсамольцаў.**

**Але я найбольш удзячная камсамольцам за тое, што ўсе даручэнні яны выконваюць ахвотна і з захапленнем. Так, нядаўна Міхаілу Хамцу і Наташы Сакаловай прапанавалі арганізаваць гурток аматараў фотасправы ў Мінскай школе № 1. З задавальненнем яны ўспрынялі гэтае даручэнне. Скажу, што гурток ужо арганізаван, думаю, ініцыятараў чакаюць поспехі.**

**Наш калектыў уключан у агульнауніверсітэцкі конкурс на лепшую групу. Вельмі прыемна гэта, і хочацца, каб група заняла адно з першых месц.**

**Т. СУБАЧ.**

# ЧЫТАЮЧЫ НАСЦЕННЫЯ ГАЗЕТЫ

**АГЛЯД ДРУКУ**

«Алгарытм» — газета маладая. Тым не менш яна паспела ўжо заваяваць папулярнасць не толькі ў студэнтаў ФПМ. Заўсёды з густам аформленая, добра ілюстраваная здымкамі, газета прыцягвае ўвагу. Матэрыялы — розныя па жанрах і па тэматыцы — напісаны жыва, цікава, чытаюцца вельмі лёгка.

Але ж усім добра вядома, што форма патрабуе адпаведнага зместу. У адносінах да «Алгарытма» гэта азначае: больш канкрэтнасці. Дзве, на наш погляд, цікавыя тэмы закранула рэдкалегія ў апошнім нумары. Гэта — як рабіць жыццё камсамольскіх груп цікавым («Агенцтва камсамольскіх навін») і аб першакурсніках, якія прыходзяць на факультэт («Дарогі, якія мы выбіраем».)

Усё, здавалася б, добра: і кампазіцыя матэрыялаў, і іх мова, але... Колькі ні чытай, не знойдзеш ні аднаго прозвішча. Голыя палажэнні і вывады, дыялог, які проста вісіць у паветры. Даведваемся, што у некаторых групах сумна. А ў якіх? Чаму б не напісаць проста: у такой вось групе такі вось не хоча выконваць камсамольскае даручэнне.

Што гэта? Боязь факту ці проста нежаданне шукаць яго. Маўляў, гэта хвалюе многіх, каму трэба —сам здагадаецца. А наколькі цікавейшымі сталі б матэрыялы, каб з'явіліся ў іх жывыя людзі, таварышы і аднакурснікі.

Другое месца на конкурсе насценнага друку заняла газета філалагічнага факультэта «Слова філолага». Здавалася б, гэта абавяжа рэдкалегію працаваць яшчэ больш сур'ёзна, патрабавальна адносіцца да кожнага матэрыялу. На жаль, такога імкнення не адчуваецца ў апошнім нумары. Чым жыве факультэт, што хвалюе студэнтаў зараз? Гэтыя пытанні так і засталіся толькі пытаннямі. А тыя матэрыялы, што змешчаны, нейкія сумныя, няпоўныя. Так, напрыклад, студэнтка IV курса Т. Жук расказвае аб Усесаюзным студэнцкім злёце, дэлегатам якога яна была («Студэнцкі форум»). Апавяданне сухое, нецікавае. Няма ў ім уласнымі вачыма ўбачаных дэталяў, свайго пачуцця.

У гутарцы са студэнтамі-філолагамі выявілася, што апошні нумар усе лічаць няўдалым. Аднак выразам «няўдалы нумар» часта можна прыкрыць некаторую халоднасць, можа нават абыякавасць да лёсу газеты.

Вельмі нядрэнна выглядае ў апошні час газета «Савецкі юрыст». Гаворка ідзе не столькі аб знешнім выглядзе, колькі аб змесце матэрыялаў. Газета стала сапраўдным люстрам жыцця факультэта. Разнастайныя рубрыкі дапамагаюць расказаць больш цікава аб вучобе і быце студэнтаў Вось некаторыя з іх:

«Вучымся ў камуністаў, расцём камуністамі», «Усесаюзны Ленінскі залік», «На кафедрах», «Наш быт» і інш. Як добрае дапаўненне выходзіць фотагазета. Апошні яе нумар, які расказвае аб размеркаванні, пасвячэнні ў студэнты, аб вучобе актыву, прысвечан 50-годдзю камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Прапануем увазе чытачоў адзін з матэрыялаў «Савецкага юрыста», інтэрв'ю з ленінскім стыпендыятам Аляксандрам Барковым.

**Радасць вучобы**

Студэнт V курса Аляксандр Баркоў карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод сваіх аднакурснікаў. Ён — староста групы, душа калектыву.

**— Прайшло пяць год, як ты ўпершыню з'явіўся на парозе нашага факультэта. Што адчуваў тады і які настрой зараз?**

— І тады і зараз я адчуваю адно — радасць. Да радасці ў першыя дні прыбаўлялася пачуццё няўпэўненасці. Я прыйшоў вучыцца з вытворчасці: працаваў шафёрам. Таму, вядома, хваляваўся. Але ўсё гэта прайшло пасля першай сесіі.

**— Ф. Э. Дзяржынскі пісаў, што ён не можа любіць напалавіну, а поўнасцю, аддаючы ўсяго сябе любімай рабоце. Мы ведаем, што ты вельмі любіш сваю будучую прафесію. Але што б ты зрабіў, каб хоць на момант адчуў, што памыліўся ў выбары прафесіі?**

— Я не марыў быць юрыстам. Рыхтаваў сябе ў авіяцыю. Многа займаўся ў аэраклубе. Але потым па стану здароўя павінен быў пакінуць заняткі. Любоў да юрыдычнай навукі прыйшла ўжо ў час вучобы. Цяпер ні за што не стаў бы мяняць прафесію.

**— Усіх выпускнікоў і студэнтаў старэйшых курсаў хвалюе пытанне размеркавання. Якую работу прапанавалі табе?**

— Мне прапанавалі суд. Гэта мяне ўпаўне задавальняе.

**— Мы надоўга зберагаем памяць аб выкладчыках, таксама, як берагуць школьнікі памяць аб сваім першым настаўніку. Хто дарагі табе, аб кім ты будзеш успамінаць усё сваё жыццё?**

— Больш усяго мне запомняцца лекцыі прафесара Іосіфа Ісакавіча Гарэліка. Я працаваў пад яго кіраўніцтвам, і мне заўсёды падабалася, што Іосіф Ісакавіч ніколі не абмяжоўваў маю самастойнасць, даваў добрыя парады.

**Матэрыял падрыхтавала Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

# ЦЯЖКА, АЛЕ ЦІКАВА

Хлапчук некалькі разоў браў у рукі анучу, каб выцерці напісанае, але потым зноў пачынаў штосьці вылічваць, крэсліць, збоку пісаў нейкія формулы. Па выразу яго твару можна было здагадацца, што ўраўненне не рашаецца.

Сорак пар вачэй назіралі за тым, што адбываецца ля дошкі. Многія ўжо знайшлі ход рашэння і цяпер чакалі, што ж атрымаецца ў таварыша. А той разгублена агледзеўся па баках і бездапаможна апусціў рукі.

Тады да дошкі падышоў студэнт V курса матэматычнага факультэта Алег Кан. Ён напісаў дзве формулы і, не кажучы ні слова, адышоў. Юра (а ля дошкі стаяў ён) паглядзеў на напісанае спачатку са здзіўленнем, але раптам яго твар засвяціўся: ён хуценька ўзяў крэйду і праз некалькі хвілін рашыў ураўненне. З палёгкай уздыхнуўшы, сеў на месца.

Аспірант кафедры геаметрыі Аляксандр Андрэевіч Юдаў запытаўся ў прысутных:

— Мабыць, хтосьці з вас рашыў ураўненне іншым метадам, больш рацыянальна?

Паднялося некалькі рук. Разабраўшы ўсе магчымыя варыянты рашэння, А. А. Юдаў сказаў:

— Зараз вашай увазе прапануецца няроўнасць,—і запісаў яе.

Да дошкі пайшла дзяўчына.

...У аўдыторыі № 606 ідуць чарговыя заняткі школы юных матэматыкаў. Тут займаюцца дзевяцікласнікі, а побач—у 607-й—вучні 10-х класаў мінскіх школ. Каля ста юных паклоннікаў матэматыкі паглыбляюць свае веды ў гэтай вельмі цікавай навуцы.

Студэнты, аспіранты, выкладчыкі матфака знаёмяць школьнікаў з невядомымі ім раней спосабамі рашэння задач, ураўненняў і няроўнасцей, развіваюць у рабят матэматычнае мысленне.

На першых занятках, якія адбыліся ў кастрычніку, дацэнт кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу Валянцін Мікалаевіч Русак сказаў:

— Я ўпэўнен, што сюды прыйшлі тыя, хто ўжо моцна пасябраваў з матэматыкай ці думае гэта зрабіць. Вы не памыліліся. Мы адкрыем вам многія тайны гэтай навукі.

З тае пары кожную сераду ў 17.30 ва універсітэце можна ўбачыць школьнікаў. Выкладчыкі факультэта часта выступаюць перад імі з лекцыямі, дакладамі, даючы рабятам дадатковыя тэарэтычныя веды. Так, напрыклад, у апошні час прафесар В. І. Вядзернікаў прачытаў даклад на тэму «Комплексныя лікі і іх прыкладанне да геаметрычных даследаванняў», дацэнт Н. В. Мяцельскі — «Методыка рашэння задач і ўраўненняў».

Вучыцца тут значна цяжэй, чым у сярэдняй школе. Але хлапчукі і дзяўчынкі, з якімі я размаўляў, казалі:

— Тым цікавей. Тут мы значна ўзбагачаем свае веды. А яны так неабходны на ўступных экзаменах.

Што ж, цяжка з імі не згадзіцца.

**У. СКУЛЬБЕДАЎ.**

# КРОК ДА ФІНАЛУ





*Пятніца мінулага тыдня зноў сабрала ў актавай зале балельшчыкаў КВЗ. На гэты раз у турніры дасціпнасці, весялосці і знаходлівасці спаборнічалі каманды фізічнага і матэматычнага факультэтаў.*

*Багатае афармленне — трапныя плакаты, жартаўлівыя лозунгі і малюнкі — спрыялі добраму настрою гледачоў. Яшчэ больш узнялі яго фантазія і гумар, дакладнасць выканання, музычнае афармленне і знешні выгляд каманды фізікаў. Яны паланілі не толькі балельшчыкаў, а і журы. З разрывам у ліку ў тры ачкі ўперад выходзяць фізікі. Але хутка шанцы на перамогу ўраўнаважваюцца. Не вельмі ўдалай у тых і другіх атрымалася аперэта. Праўда, і тут былі прыемныя знаходкі ў абедзвюх каманд.*

*Матэматыкі не разгубіліся пасля першага паражэння і, выдатна справіўшыся з дамашнім заданнем, выйшлі ўперад. Замацаваў іх поспех конкурс паэтаў. Тут яны аказаліся больш лірычнымі і кваліфікаванымі. Не адбіўся на зыходзе турніру і конкурс капітанаў.*

*Увогуле на працягу турніру не ўсё было раўнацэнна: дасціпныя, смешныя адказы і жарты суседнічалі з сумнымі і нават грубымі. Зацягнутымі і нецікавымі выглядалі асобныя віды праграмы.*

*Не справіліся са сваёй задачай прэс-цэнтры, хоць спачатку нядрэнна заявілі аб сабе матэматыкі.*

*Сустрэча закончылася з лікам 43:42 на карысць каманды матэматычнага факультэта.*

*А. БЯЛЬКО.*



# У СВЕЦЕ ЦУДОЎНАГА

Амаль у кожнага чалавека ёсць сваё захапленне. Адны любяць маляваць, другія — спяваць. Ну, а тыя, што з'яўляюцца членамі танцавальнага гуртка, зразумела, любяць танцы.

Два разы ў тыдзень надвячоркам можна бачыць, як да корпуса філфака спяшаюцца дзяўчаты і хлопцы з танцавальнага. Яшчэ некалькі хвілін—і яны апынаюцца ў свеце цудоўнага.

І сапраўды, ці не цудоўна, калі прагучаць першыя акорды, разальецца па зале знаёмая мелодыя і закружацца ў вясёлай польцы твае сябры па курсу, па вучобе. Здаецца, што не было стомленасці, бо так лёгка і хутка выстукваюць абцасікі дзяўчат...

Але лёгкасць такая з'явілася не адразу. Даводзілася нямала адпрацоўваць адзін і той жа рух, каб потым, на канцэрце, парадаваць гледачоў сваім уменнем.

Гурток пакуль незялікі. Але ж і існуе ён толькі другі год. Кіруе ім студэнтка II курса Лена Скурко. Тут сабраліся сапраўдныя аматары танца. Ну, і як заўсёды бывае ў артыстаў, сваё майстэрства яны выносяць на суд гледачоў.

Канцэртаў было шмат. Выязджалі філфакаўцы ў падшэфныя школы, выступалі на факультэце перад сваімі сябрамі. Кожная паездка, кожнае выступленне будзе помніцца доўга. Бо колькі канцэртаў — столькі і хваляванняў. А як прыемна бачыць, што танцы падабаюцца людзям, і чуць у падзяку апладысменты—узнагароду за доўгую працу, без якой не было б ні хараства, ні майстэрства, ні самога танца.

На памылюся, калі скажу, што з самых прыемных і радасных дзён быў той, калі кіраўніку гуртка Лене Скурко, Валянціне Церашковай, Зоі Стукан, Тані Вярбіцкай і іншым дзяўчатам і хлопцам стала вядома, што іх ансамбль заняў першае месца на універсітэцкім аглядзе мастацкай самадзейнасці. Гэта быў вялікі поспех маладога калектыву.

Зноў наступіць вечар, горад ахутае цемра. А ў філалагічным корпусе загарыцца святло. У гэты час спяшаюцца на рэпетыцыю дзяўчаты і хлопцы з танцавальнага.

**Н. ЖУГІНА, студэнтка.**

# Я НЕ САМОТНЫ, Я КНІГУ МАЮ...

СПОЎНІЛАСЯ 80 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта Максіма Адамавіча Багдановіча. Яму было дваццаць пяць, калі спыніла свой бег сцяжынка жыцця.

Літаратурны скарб, пакінуты паэтам, невялікі: адзін зборнік вершаў «Вянок». Але ўжо тое, што М. Багдановіч стаіць у радзе сусветна вядомых паэтаў-лірыкаў, сведчыць аб незвычайным таленце паэта. Вершы, санеты, трыялеты Багдановіча кранаюць сваёй лірычнасцю і музычнасцю. Яны наскрозь пранізаны дэмакратычнай думкай. Лёс беларусаў заўсёды хваляваў душу паэта, жыў у яго сэрцы. Ён прарочыў сваёй старонцы:

Не згасла сонца! Сонца гляне,
Усіх падыме ада сна.
Ён, гэты дзень, яшчэ настане,—
І ачуняе старана!

І ён настаў, гэты светлы, шчаслівы дзень, які асвяціў жыццё прыгнечанага народа зарой Кастрычніка. Усяго некалькі месяцаў не дажыў да яго Багдановіч.

Урачыста адзначыў юбілей паэта наш універсітэт. Кафедра беларускай літаратуры філфака і супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі вечар, які адбыўся ў актавай зале філалагічнага корпуса. Сюды прыйшлі студэнты, выкладчыкі універсітэта і ўсе тыя, хто любіць паэзію Багдановіча.

Аб месцы, якое займае творчасць Максіма Багдановіча ў беларускай літаратуры, аб тым багацці, што пакінуў паэт, натхнёна гаварыў, адкрываючы вечар, кандыдат філалагічных навук К. Р. Хромчанка. Ён адзначыў, што імя Максіма Багдановіча стаіць у беларускай літаратуры побач з імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, што Багдановіч — волат духоўнай культуры беларусаў.

Усхвалявана і ўзнёсла расказаў пра жыццёвы і творчы шлях паэта прафесар кафедры беларускай літаратуры А. А. Лойка. Да сэрца кожнага ён данёс тыя адметныя штрыхі з жыцця паэта, якія дазволілі жыва ўявіць высокага, стройнага юнака з задуменнымі блакітнымі вачыма, пакінуўшага літаратуру ў поўным росквіце таленту. Але паэт без сумнення ўсведамляў, што пражыў жыццё не дарэмна. У апошніх радках ён пісаў:

У краіне светлай, дзе я ўміраю,
У белым доме, ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты...

Багдановіч жыве і будзе жыць сярод нас як выдатны майстар паэтычнага радка, як узор патрыятычнага служэння сваёй Айчыне. Беларускі народ помніць аб ім. Свае вершы, прысвечаныя Багдановічу, прачыталі на вечары паэты Н. С. Гілевіч і Р. М. Семашкевіч. Маладыя «ўзлётаўцы» Людміла Забалоцкая, Кацярына Кункевіч, Анатоль Шушко і іншыя таксама выступілі са сваімі творамі. З вялікай увагай слухалі прысутныя ўспаміны стрыечнай сястры М. Багдановіча Ганны Купрыянаўны Грызновай, якая прыехала ў Мінск з г. Горкага напярэдадні юбілею. Яна часта бывала ў сям'і Багдановічаў і таму расказала шмат цікавага аб юнацкіх гадах паэта.

Заключнай часткай вечара быў канцэрт.



Студэнты падрыхтоўчага факультэта ў час экскурсіі на Мінскім камвольным камбінаце.

Фота М. Нечыпарэнкі.

# СЯРГЕЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ КАЛІШЭВІЧ



Пасля цяжкай хваробы заўчасна памёр загадчык кафедры фізіялогіі і біяхіміі раслін дацэнт Сяргей Уладзіміравіч Калішэвіч.

Нарадзіўся С. У. Калішэвіч 15 верасня 1903 года ў гарадскім пасёлку Драгічын Брэсцкай вобласці ў сям'і настаўніка. Пасля заканчэння ў 1926 годзе Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі да 1934 года працаваў там жа асістэнтам, а затым з 1934 года перайшоў працаваць на кафедру фізіялогіі раслін у Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Працуючы дацэнтам кафедры, С. У. Калішэвіч з 1948 па 1952 год быў дэканам біялагічнага факультэта, а з 1960 г. да апошніх дзён жыцця ўзначальваў кафедру фізіялогіі раслін.

За многія гады працоўнага жыцця С. У. Калішэвіч праявіў сябе ўмелым арганізатарам вучэбнага працэсу, таленавітым педагогам і даследчыкам.

Асноўную навуковую дзейнасць ён прысвяціў праблеме фотасінтэзу і мінеральнага жыўлення раслін. Яшчэ ў даваенны перыяд ім выканана серыя арыгінальных работ па вывучэнню марфалогіі пласціднага апарата раслін і накапленню ў іх пігментаў, што дало магчымасць глыбей пазнаць механізм біясінтэзу хларафілу. У наступныя пасляваенныя гады С. У. Калішэвіч асноўную ўвагу ўдзяляў вывучэнню фарміравання пласціднага апарата ў сувязі з уплывам разнастайных фактараў асяроддзя. Здзяйсняючы цесную сувязь з сельскагаспадарчай вытворчасцю, ён выканаў важныя даследаванні па барацьбе з паляганнем сельскагаспадарчых раслін. Дэталёва вывучаны рост і развіццё зернявых культур у сувязі са змяненнем пласціднага комплексу лісцяў на тарфяных глебах ва ўмовах разнастайнага мінеральнага жыўлення, вільготнасці глебы, аэрацыі і паказана залежнасць росту парастка і каранёвай сістэмы зернявых культур ад глебавых умоў. Гэтыя работы маюць вялікае значэнне пры рашэнні праблемы палягання злакаў, асабліва ва ўмовах тарфяна-балотных глеб, якія займаюць значныя плошчы на тэрыторыі БССР.

Валодаючы вялікімі ведамі ў галіне мікраскапіі, анатоміі і фізіялогіі раслін, С. У. Калішэвіч з вялікай энергіяй перадаваў навуковы вопыт сваім шматлікім выхаванцам і вучням і вырасціў вялікі калектыў маладых фізіёлагаў раслін, узброіўшы іх глыбокімі ведамі і любоўю да навукі. Кандыдаты і дактары навук з падзякай успамінаюць дакладныя кансультацыі і строгі, але ў той жа час добразычлівы разбор іх дысертацый.

С. У. Калішэвіч быў адным з вядучых выкладчыкаў біялагічнага факультэта. Яго лекцыі заўсёды былі цікавыя, змястоўныя і вызначаліся высокім ідэйна-тэарэтычным узроўнем. Валодаючы выключнай працаздольнасцю, гатоўнасцю ўсе сілы аддаць справе падрыхтоўкі кадраў, нязменнай дружалюбнасцю да таварышаў па рабоце і асаблівай увагай да студэнцкай моладзі, С. У Калішэвіч заслужана карыстаўся глыбокай павагай калектыву.

С. У. Калішэвіч праводзіў вялікую грамадскую работу. Ён неаднаразова выбіраўся членам і старшынёй акружной камісіі па выбарах у мясцовыя Саветы, працаваў старшынёй БРК саюза вышэйшай школы, быў членам прэзідыума гэтага саюза, сакратаром партбюро біялагічнага факультэта, членам парткома БДУ.

У цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны С. У. Калішэвіч знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі і за баявыя заслугі меў шматлікія ўзнагароды.

За поспехі ў развіцці навукі і падрыхтоўцы кадраў і ў сувязі з 50-годдзем універсітэта С. У. Калішэвіч узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Цяжка ўявіць, што не стала цудоўнага чалавека, вялікага знаўцы ў галіне анатоміі і фізіялогіі раслін, таленавітага педагога і выхавацеля моладзі. Светлая памяць аб С. У. Калішэвічу —нястомным працаўніку, беззапаветна служыўшаму Савецкай Айчыне, назаўсёды застанецца ў сэрцах усіх, хто яго ведаў.

**Група таварышаў.**

АД ТЭОРЫІ — ДА ПРАКТЫКІ!

# КАЛІ ХОЧАШ БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ

**Аб цудоўным уплыве фізкультуры на арганізм чалавека вядома ўсім. Многія накапілі шмат тэарэтычных ведаў аб тым, як зберагчы здароўе. Але, на жаль, практычныя крокі ў гэтым напрамку робяць не многія. Каб выправіць такое становішча і далучыць да заняткаў фізічнай культурай і спортам выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта сярэдняга і старэйшага ўзросту, спартыўнамасавая камісія мясцкома сумесна з кафедрай фізвыхавання і спорту арганізуе спецыяльную групу «Здароўе».**

**— Мы запрашаем у гэтую групу ўсіх, хто хоча ўмацаваць свае сілы, набыць бадзёрасць, адчуць цудоўнае ўздзеянне гаючых фактараў прыроды, — гаворыць старшыня камісіі ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Соф'я Іванаўна Федарэнка. — Заняткі будуць праводзіць вопытныя трэнеры пад пастаянным урачэбным кантролем фізкультурных урачоў. У нас ёсць усе магчымасці арганізоўваць лыжныя прагулкі, нядзельныя выезды за горад, трэніроўкі па настольнаму тэнісу і плаванню. Шмат цікавага ёсць у планах, якія трэба ўзгадніць з тымі, хто будзе займацца ў групе «Здароўе».**

**Заўтра, у пятніцу, у 14.00 на кафедры фізвыхавання і спорту адбудзецца арганізацыйнае пасяджэнне групы «Здароўе». Просьба да выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія жадаюць займацца ў групе, прыйсці ў назначаны час на кафедру. А. АЛЕНІЧ.**

# БЛІЗАРУКАСЦЬ І ЯЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ



Зрок з'яўляецца адным з дзівосных дараў прыроды. Ён дае нам значна больш уражанняў, чым іншыя пачуцці (слых, дотык, нюх, смак). У 30—40 працэнтаў людзей святло, пранікаючы ў вока, дае акрэслены паказ аддаленых прадметаў на сятчатцы. У іншых промні святла ад разглядаемых прадметаў факусіруюцца ўпераддзе сятчаткі (у блізарукім воку) або за ёй (у дальназоркім воку).

Блізарукасць паяўляецца ў асноўным у школьныя гады. Узнікае яна ў тых, хто працяглы час займаецца ў дрэнных гігіенічных умовах: пры недастатковым асвятленні рабочага месца, карыстанні падручнікам з невыразным шрыфтом, пры няправільнай пасадцы ў час работы і адсутнасці рэгулярных перапынкаў, а таксама пасля перанесеных дзіцячых інфекцый і пры непаўнацэнным харчаваннні.

Для папярэджання блізарукасці вялікае значэнне мае правільны рэжым дня. Раніцай неабходна рабіць фізічную зарадку, расціраць цела вільготным ручніком. Трэба займацца спортам: хадзіць на лыжах, катацца на каньках, плаваць, іграць у валейбол, тэніс. Блізарукасць часцей развіваецца ў тых, хто мала бывае на паветры, не займаецца спортам.

Неабходна пасля лекцый ва універсітэце адпачыць гадзіны 2—3, лепш на свежым паветры, а пасля прыступаць да дамашніх заняткаў, робячы дзесяцімінутны перапынак праз кожныя 40—45 мінут работы. Начны сон павінен быць не меней 8 гадзін.

Пры праглядзе тэлевізійных перадач нельга садзіцца блізка да экрана. Адлегласць павінна быць не менш 3 метраў.

Неабходна арганізаваць паўнацэннае харчаванне з дастатковай колькасцю бялкоў, тлушчаў, вугляводаў і вітамінаў. Сметанковае масла, рыбны тлушч, курыныя яйкі, морква, апельсіны, лімоны, памідоры, капуста, цыбуля ўтрымліваюць вітаміны, неабходныя для паляпшэння зроку.

Блізарукім людзям для папярэджання ўскладненняў нельга падымаць цяжары, выконваць фізічныя практыкаванні, звязаныя з рэзкімі нахіламі, скачкамі.

Ахова зроку чалавека з'яўляецца важнай задачай савецкай медыцыны. Падтрыманне правіл гігіены зроку, паўнацэннае харчаванне, умацаванне і загартоўка арганізма, прафілактыка дзіцячых інфекцыйных захворванняў — усё гэта папярэджвае развіццё блізарукасці.

Не менш 2 разоў у год кожнаму неабходна правяраць вастрыню зроку ў акуліста.

**С. РАБУШКІНА,**
**урач-акуліст.**

# ЯК ЧЫТАЦЬ ХУТКА

**Каб упарадкаваць паток інфармацыі, выдаюцца рэфератыўныя часопісы і бюлетэні. Але і на тое, каб з імі азнаёміцца, патрэбен час. Ці можа чалавек чытаць у тры ці чатыры разы хутчэй?**

**Дынамічнае чытанне вядома даўно. Надзвычай хутка чыталі Бальзак, Жан-Жак Русо, Пушкін, Чарнышэўскі... Мы ведаем таксама па ўспамінах сучаснікаў, як чытаў Ленін.**

**Навукова даказана, што чалавек можа чытаць хутчэй, чым звычайна, у 6—7 разоў, і гэта прынясе толькі карысць — разаўе памяць, зробіць больш кампактным успрыняцце інфармацыі.**

**Многія чытачы «субвакаліруюць», г. зн. пры чытанні шавеляць галасавымі звязкамі. Аднак людзі, якія так чытаюць, не могуць асіліць больш 150 слоў у мінуту.**

**Аказваецца, на скорасць чытання накладвае сваю руку «фанетызацыя». З дзяцінства, як толькі дзіця пачынае чытаць, яго вучаць спачатку «будаваць» з літар склады, пасля — са складоў слова, затым ужо — звязваць словы ў цэлыя фразы.**

**Вось тут і адчуваецца недасканаласць нашага арганізма. Хоць магчымасці чалавечага мозгу ў сэнсе ўспрыняцця інфармацыі па сутнасці неабмежаваны, гэта інфармацыя паступае туды толькі праз органы пачуццяў, якія адыгрываюць ролю датчыкаў. А іх прапускная здольнасць не такая ўжо вялікая. Прычым прапускная здольнасць нашага слыхавога канала ўспрыняцця інфармацыі па крайняй меры ў дзесяць разоў меншая, чым прапускная здольнасць зрокавага. Вось і атрымліваецца, што калі чалавек чытае «пра сябе», ён міжволі стараецца ўзнавіць адпаведны літаральнаму і славеснаму тэксту гуказарад, а значыць, хутчэй чуе, чым бачыць. Адсюль чытаемую інфармацыю ён накіроўвае не па зрокавых, а па слыхавых каналах. Гэтым самым ён штучна стрымлівае скорасць свайго чытання.**

**Значыць, той, хто хоча чытаць хутка, павінен, узброіўшыся цярпеннем і воляй, вучыцца «схопліваць» цэлыя фразы, радкі, абзацы тэксту. Для таго, хто многа чытае, прымусіць сябе чытаць хутчэй, ахопліваючы поглядам цэлую групу слоў, не так цяжка — дзейнічае прынцып «пазнавання». На ім і базіруецца сучасная методыка навучання.**

**Іменна гэты прынцып пакладзен у аснову выкладання ў інстытутах дынамічнага чытання, створаных за рубяжом. Закончыўшыя іх затрачваюць на чытанне адной старонкі кнігі не 1,5 мінуты, як звычайна, а 10 і менш секунд.**

**Пытанне аб «хуткачытанні» становіцца ўсё больш важным. Само жыццё пабуджае нас чытаць хутчэй.**

*21 снежня а 17-й гадзіне ў чытальнай зале № 3 галоўнага корпуса адбудзецца дыспут па творы А. Ананьева «Вёрсты любві» (часопіс «Новый мир», №№ 8—10, 1971 г.).*

*КАФЕДРА РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. БІБЛІЯТЭКА.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 09548 Заказ 1518.